## Па тваіх, Ільіч, запаветах

# 2. Перабудова вескі

### АБ ЧЫМ РАСКАЗАЛА КНІГА НАРОДНАЙ СЛАВЫ



Неспакойныя і напружаныя дні перажывалі масы сялян у вёсцы пасля заваёвы улады пралетарыятам. Самай цяжкай і самай складанай у гэты час была перабудова вёскі на новы грамадскі лад. На гэта спатрэбіліся гады напружанай і выхаваўчай работы партыі і людзей верных яе ідэям. Іскарку новага, народжанага пралетарскай рэвалюцыяй, прынёс у Баханы, вярнуўшыся з радоў рабоча—сялянскай арміі, змагар за калектыўнае грамадства Лявон Захаравіч Зубачоў. Ен умела арганізоўваў аднавяскоўцаў на ажыццяўленне ленінскага Дэкрэту аб зямлі, растлумачваў значэнне праводзімай бальшавіцкай партыяй аграрнай палітыкі.

Вестку аб перадачы зямлі сялянам у вёсцы сустрэлі з вялікай задаволенасцю. Тут пачаліся рэвалюцыйныя пераўтварэнні. Асабліва ў гэты перыяд актывізавалася бедната. Яна са свайго асяроддзя выдзеліла групу людзей, якая займалася раздзелам памешчыцкай і царкоўнай маёмасці, лугоў, зямлі. Яе атрымліваў той, хто гадамі на ёй праліваў пот. У выніку сяляне атрымалі каля 39 дзесяцін царкоўнай зямлі.

Многія з сялян пачалі будаваць на гэтай зямлі свае асабістыя гаспадаркі. Даставалася ад беднаты і мясцоваму кулацтву. Дапамогу сялянскай беднаце ў перабудове вёскі аказвалі пасланцы партыі — рабочыя, прысланыя з вобласці. Яны праводзілі растлумачальную работу сярод беднякоў і серадНякоў. Ад іх бедната даведвалася, якія ў гэты перыяд ускладзены на іх задачы і, што яны павінны рабіць для ўмацавання ўлады народа.

Так паступова бедната аб'ядноўвалася ў невялікія калектывы, мэтай якіх было ліквідаванне несправядлівасці ў выкарыстанні ворыўных земляў, лугоў і іншых сельскагаспадарчых угоддзяў.

Характэрным для гэтага перыяду было тое, што ў вёсцы стварауся мясцовы Савет — ядро Савецкай улады. Пачатак яго заснавання — 1919 год. Асноўнай задачай Савета ў гэты час было выкананне заказаў маладой Савецкай дзяржавы па забеспячэнню арміі і гарадоў неабходнай сельскагаспадарчай прадукцыяй, падтрыманне парадку на сяле.

Вялікую работу праводзілі члены сельвыканкома сярод баханцаў па падрыхтоўцы іх да ўступлення ў калгасы.

Так, дзякуючы намаганням рабочага класа і сельскай беднаты ў цесным саюзе з серадняком была закладзена аснова калектыўнай гаспадаркі.

**І. Барысенка.**

**Барысенка, І.** Перабудова вёскі : аб чым расказала Кніга Народнай Славы / І. Барысенка // Шлях Кастрычніка.

*Перабудова вёскі Баханы, пасля заваёвы улады пралетарыятам.*